УДК: 94(476)«1920/1924»:329.7

А. У. Дзянісаў, асістэнт

# ДОБРААХВОТНЫЯ ГРАМАДСКІЯ АРГАНІЗАЦЫІ Ў САВЕЦКАЙ БЕЛАРУСІ ЯК АБ'ЕКТ ДЗЯРЖАЎНАЙ ПАЛІТЫКІ Ў 1920–1924 ГГ.

This article examines the emergence of voluntary community organizations (especially organizations of history, as well as others) the main directions of state policy towards them in the Soviet of Belarus in 1920–1924, which was embodied in the documents and regulations that govern their social activities, the process of registration, obtaining permits for congresses, etc. Crucial policy had in the early 1920. The article presents the different points of view on this issue. Gradually, the order permits the activities of the organizations has changed more accurately, allowing public authorities to prevent undesirable activities of his organization, not to allow anti-sentiment. This topic is the weak level of study previously had not been considered in detail by researchers.

**Уводзіны.** Тэма ўзаемаадносін добраахвотных грамадскіх аб'яднанняў, таварыстваў і саюзаў і ўладавых структур ў першай палове 1920-х гг. уяўляе дастатковы інтарэс.

Характэрнай рысай для першых паслярэвалюцыйных гадоў на тэрыторыі былой Расійскай імперыі было значнае павялічэнне колькасці разнастайных добраахвотных грамадскіх арганізацый. Абуджэнне новай грамадскасці пасля рэвалюцыі, арганізацыя творчых аб'яднанняў дзеячаў культуры, асветы, навукі былі заканамернай з'явай. У хуткім часе гэтыя грамадскія саюзы і таварыствы зрабіліся аб'ектамі дзяржаўнай палітыкі. Іх дзейнасць, узнікненне і ліквідацыя быдла цесна звязана з напрамкамі дзяржаўнай палітыкі. Вырашальнымі для лёсу грамадскіх арганізацый з'явіліся 1920–1924 гг., калі былі выпрацаваны асноўныя дакументы, якія рэгулявалі іх дзейнасць.

**Асноўная частка.** Савецкая Беларуская Рэспубліка знаходзілася пасля падзей грамадзянскай вайны і акупацыі ў складаным эканамічным, сацыяльным і культурным становішчы. Жыццё ставіла перад Савецкай уладай праблемы, звязаныя, з аднаго боку, з пераадоленнем разбурэнняў і эканамічнай адсталасці нацыянальных рэспублік, з іншага боку, мелася вялікая патрэба ў культурным будаўніцтве. Іх вырашэнне патрабавала выкарыстання ў поўнай меры прыродных і сацыяльных рэсурсаў, развіцця народнай адукацыі, даследчай працы.

Уладамі былі зроблены захады па ліквідацыі непісьменнасці, развіццю сістэмы народнай адукацыі, арганізацыі вышэйшых навучальных устаноў. Ужо ў красавіку 1919 г. аднаўляе дзейнасць Горацкі сельскагаспадарчы інстытут, а ў 1921 г. у Мінску быў адчынены Беларускі дзяржаўны універсітэт [1, с. 41]. Вывучэннем эканомікі, вытворчых сіл і прыродных багаццяў краю ў 1921–1922 гг. вельмі актыўна займаліся Эканомнарада (Экономсовещание) Беларусі, Эканамічнае аддзяленне факультэта грамадскіх навук у Мінску і Беларуская культурна-навуковая асацыяцыя пры Пятроўскай сельскагаспадарчай акадэміі. Пры Статыстычным бюро Беларусі і Савеце народнай гаспадаркі ажыццяўляліся таксама працы па зборы матэрыялаў, якія характарызавалі народную гаспадарку Беларусі. Вынікі такіх даследаванняў друкаваліся ў часопісе «Народная гаспадарка Беларусі».

На тэрыторыі Беларусі ў гэты перыяд, нягледзячы на цяжкае сацыяльна-эканамічнае становішча і пасляваенныя наступствы, актыўна дзейнічалі добраахвотныя арганізацыі.

Пасля кастрычніцкай рэвалюцыі прадстаўнікі таварыстваў, адчуваючы патрэбу ў легалізацыі, накіравалі прашэнні аб рэгістрацыі ў дзяржаўныя структуры. Рэгістраваліся таварыствы ў разнастайных месцах: у Народным камісарыяце асветы, у НКУС, у ВЦВК, у Саветах, у міліцыі і інш. Так, Мінскае педагагічнае таварыства, якое ставіла сваёй мэтай аб'яднанне працаўнікоў асветы для выпрацоўкі і рэалізацыі педагагічных ідэй і прынцыпаў, было зарэгістравана пры Наркамаце асветы 4 красавіка 1919 г. На першых парах дзяржава не ажыццяўляла канкрэтных мераў па рэгуляванні дзейнасці грамадскіх арганізацый у сваіх узаемаадносінах з імі. Адзінай і галоўнай умовай прызнання саюза ці таварыства з'яўлялася супастаўленне мэты грамадскага аб'яднання існуючаму правапарадку, іншымі словамі, адсутнасць супярэчнасці паміж мэтамі аб'яднання і законамі дзяржавы. Адсутнасць дакладнага агульнага заканадаўства аб таварыствах і саюзах прывяло да таго, што шмат таварыстваў ажыццяўлялі сваю дзейнасць без усялякай рэгістрацыі. Наркамат асветы прапанаваў таварыствам актыўна ўключыцца ў культурна-асветную дзейнасць і пачаў аказваць некаторую фінансавую падтрымку (напрыклад, фінансаванне экспедыцый і даследаванняў Мінскага таварыства гісторыі і старажытнасцей).

3 жніўня 1922 г. ЦВК і СНК РСФСР была зацверджана пастанова «Аб парадку зацвярджэння і рэгістрацыі таварыстваў, не праследуючых мэтаў абагачэння», а 10 жніўня зацверджана інструкцыя да яе. Гэта быў першы заканадаўчы акт аб таварыствах і саюзах, які рэгламентаваў усе бакі іх узнікнення, афармлення і дзейнасці, іх месца ў палітычным, грамадскім і культурным жыцці таварыства. Гэты дакумент устанаўліваў парадак іх рэгістрацыі наступным чынам: ніводнае

з таварыстваў (акрамя прафесійных саюзаў) не магло пачаць сваёй дзейнасці без рэгістрацыі ў Народным камісарыяце ўнутраных спраў (НКУС) і яго мясцовых органах [1, с. 29].

У Беларусі Цэнтральным выканаўчым камітэтам ССРБ 13 кастрычніка 1922 г. была выдадзена спецыяльная пастанова «Аб парадку зацвярджэння і рэгістрацыі таварыстваў, не праследуючых мэтаў абагачэння і аб парадку нагляду за імі», выйшла і адпаведная інструкцыя [2, арк. 17–19]. Таксама была выдадзена інструкцыя «Па выдачы дазволаў на скліканне з'ездаў і сходаў разнастайных арганізацый, саюзаў і аб'яднанняў» [3, арк. 20–20 адв.].

Таварыства павінна было прадставіць у НКУС свой устаў, спіс членаў па адпаведнай форме, пратакол сходу аб стварэнні таварыства і заплаціць гербавы збор (100 рублёў). Таварыствы і саюзы, якія не зарэгіставаліся ў двухгадовы тэрмін пасля апублікавання гэтай пастановы, абвяшчаліся зачыненымі [4, арк. 17].

Побач з аналагічнымі пунктамі пастановы ЦВК РСФСР пастанова ЦВК БССР мела шэраг удакладненняў і заўваг. НКУС Беларусі быў абавязаны ў тыднёвы тэрмін звязацца з НКУС РСФСР, накіраваўшы запрос аб магчымасці рэгістрацыі той ці іншай арганізацыі [2, арк. 25].

У гэты ж час Дзяржаўнае палітычнае ўпраўленне (ДПУ) пачынае наладжваць цесны кантакт з НКУС Беларусі па пытаннях зацвярджэння створаных на тэрыторыі ССРБ грамадскіх арганізацый і таварыстваў. ДПУ павінна было мець на ўліку ўсе добраахвотныя грамадскія арганізацыі з мэтай іх кантролю. Усе матэрыялы, якія атрымліваў НКУС аб таварыствах, павінны былі накіроўвацца ў Сакрэтнае аддзяленне ДПУ Беларусі і толькі пасля санкцыі цэнтральных органаў ДПУ маглі быць зацверджаны НКУС. Па ўсіх гэтых пытаннях НКУС павінен быў звязвацца з упаўнаважаным сакрэтнага аддзялення ДПУ па справах таварыстваў [2, арк. 25].

Рэгістрацыя давала таварыству толькі афіцыйнае прызнанне для далейшага існавання на аснове закону. Пастанова аддзяляла дабрачынныя таварыствы ад тых, хто меў карысныя мэты. Аднак гэта не значыла, што дабрачынныя таварыствы не маглі весці гаспадарчую дзейнасць: выдавецкую, энцыклапедычную, збіральніцкую, творчую, якая вымагала фінансавых сродкаў.

Пры перарэгістрацыі НКУС накіроўваў запрос аб зацвярджэнні статута таварыства ў адпаведны наркамат, якому дзейнасць таварыства было блізкай, а таксама ў ДПУ. Пастанова 1922 г. зводзіла нагляд за дзейнасцю таварыстваў да рэгістрацыі, праверкі спісаў членаў, зацвярджэння статутаў. Дзяржаўныя органы не патрабавалі ад таварыстваў звестак аб фінансавай дзейнасці, цэнзуры лекцый, тэм пасяджэнняў і інш.

Краязнаўчыя таварыствы і арганізацыі рэгістраваліся ў губернскіх аддзелах упраўлення. Губернскія аддзелы карысталіся пры рэгістрацыі спецыяльнымі сакрэтнымі цыркулярамі НКУС і інструкцыямі СНК аб парадку рэгістрацыі [5, арк. 25]. Па сакрэтным цыркуляры № 1488/с ад 1 верасня 1922 г. аддзелы ўпраўлення рэгістравалі статуты і дазвалялі праводзіць з'езды добраахвотных арганізацый толькі мясцовага значэння, якія ў сваёй дзейнасці не выходзілі за межы губерні. Губернскія аддзелы рэгістравалі статуты і дазвалялі з'езды арганізацый толькі пасля запросаў у ДПУ і атрымання адтуль станоўчага адказу. У ДПУ аддзеламі прадстаўляліся падрабязныя звесткі аб таварыствах (статут, спіс членаў і інш.) [4, арк. 26].

Статуты таварыстваў і саюзаў, дзейнасць якія выходзіла за межы губерні і распаўсюджвалася на тэрыторыю краіны, павінны былі рэгістравацца ў НКУС [4].

10 кастрычніка 1922 г. НКУС ССРБ звярнуўся да аддзелаў упраўлення выканаўчых камітэтаў ССРБ з паведамленнямі аб справах рэгістрацыі таварыстваў і саюзаў, не маючых мэтаў абагачэння, і аб парадку нагляду за імі. Уся праца па гэтых пытаннях павінна была праводзіцца выключна НКУС [2, арк. 25–26].

Між іншым, некаторымі аддзеламі ўжо былі дадзены распараджэнні таварыствам аб прадстаўленні ім даных для рэгістрацыі. У гэтым выпадку НКУС прадпісваў аддзелам рэгістрацыю гэтых таварыстваў не праводзіць і дазволаў на правядзенне з'ездаў і сходаў не даваць, усе даныя аб таварыствах перадаць у НКУС і ўвогуле ўстрымацца ад вядзення работы па гэтых пытаннях. Паступіўшыя заявы на рэгістрацыю таксама павінны былі быць накіраваны аддзеламі ў НКУС [5, арк. 55–57].

Так, Барысаўскі павятовы выканаўчы камітэт 23 верасня выдаў пастанову № 139 аб рэгістрацыі мясцовых таварыстваў і саюзаў, якая абавязвала іх падаць усе неабходныя дакументы для рэгістрацыі ў павятовы выканаўчы камітэт у двухтыднёвы тэрмін [2, арк. 46]. Заявы былі пададзеныя ад Саюза веруючых católікаў, Праўлення барысаўскага яўрэйскага пахавальнага таварыства і Беларускай культурна-навуковай грамады. Аднак у кастрычніку 1922 г. гэтая пастанова была анулявана, а ўсе даныя аб таварыствах былі накіраваныя ў НКУС [5, арк. 57].

Беларуская культурна-навуковая грамада ў Барысаве, якая налічвала каля 65 сяброў, сярод сваіх культурна-асветніцкіх мэтаў ставіла і заняцце краязнаўствам (аб'яднанне асаблівасцяў і старажытнасцяў Барысаўшчыны, адкрыццё музеяў і выставаў культуры краю, правядзенне курсаў і лекцый па краязнаўству і інш.). Статут таварыства быў зацверджаны [2, арк. 39].

Меркаваць, чым кіравалася ДПУ і НКУС пры прадстаўленні дазволу для рэгістрацыі, дазваляе наступны дакумент. У маі 1924 г. у сакрэтнае аддзяленне ДПУ з НКУС была пера-

дадзена заява на рэгістрацыю статута Магілёўскага таварыства краязнаўства з усімі неабходнымі матэрыяламі. ДПУ адказаў, што лічыць неабходным устрымацца ад зацвярджэння Магілёўскага таварыства краязнаўства. Падставай для ДПУ было тое, што сярод членаў праўлення таварыства не было ніводнага члена Камуністычнай партыі [6, с. 221–222].

30 студзеня 1923 г. НКУС ССРБ разаслаў аддзелам упраўлення выканкомаў «Правілы закрыцця і ліквідацыі таварыстваў і саюзаў, ня маючых мэтаў абагачэння». Па гэтых правілах маёмасць, якая заставалася пасля закрыцця або самаліквідацыі таварыства, павінна быць перададзеная ў карыстанне Сабесу [2, арк. 39].

9 мая 1924 г. была выдадзена пастанова ЦВК і СНК СССР «Аб парадку зацвярджэння ўставаў і рэгістрацыі таварыстваў і саюзаў, не праследуючых мэтаў абагачэння і распаўсюджваючых сваю дзейнасць на тэрыторыі ўсяго Саюза ССР, і аб наглядзе за ім», якая рэгламентавала стан агульнасаюзных таварыстваў. З гэтага часу праекты стварэння саюзных таварыстваў павінны былі прадстаўляцца ў СНК СССР, а рэгістрацыя таварыстваў і нагляд за імі ажыццяўляліся НКУС саюзных рэспублік [5, с. 31–32]. Гэта пастанова змяніла шлях рэгістрацыі. Калі раней таварыства проста рэгістравалася, то цяпер яно падавала дакументы на дазвол з боку ўладаў. Яна зноў усталявала, як і да рэвалюцыі, дазвольны, а не рэгістрацыйны парадак стварэння таварыстваў і саюзаў, што з'явілася вельмі істотным крокам на шляху да адзяржаўлення грамадскіх арганізацый.

Да канца 1924 г. ад НКУС атрымала дазвол на дзейнасць каля 28 добраахвотных грамадскіх таварыстваў, сярод якіх былі Мінскае таварыства гісторыі і старажытнасцяў, Беларускае таварыства пралетарскага студэнцтва, Мінскае таварыства ўрачоў, таварыства «Дынама», Беларускі раённы аддзел таварыства філатэлістаў і інш. [7, арк. 55].

**Заключэнне.** Такім чынам, можна зрабіць высновы, што у перыяд 1920–1924 гг. характар дзяржаўнай палітыкі ў адносінах да добраахвотных грамадскіх арганізацыя паступова змяняўся. У 1920 – у першую палову 1922 гг. галоўным крытэрыем легалізацыі дзейнасці была лаяльнасць да савецкай улады. Пачынаючы з 1922 г. у легалізацыі дзейнасці таварыстваў выкарыстоўваўся прынцып рэгістрацыі ў выніку прывядзення арганізацыі і актавай дакументацыі таварыства ў вызначаныя нормы. З 1924 г. прынцып рэгістрацыі замяняецца прынцыпам атрымання дазволу пасля праверкі даных аб мэтах, складзе і выніках дзейнасці таварыстваў. Усталяванне больш жорсткага кантролю над стварэннем і дзейнасцю таварыстваў і саюзаў, прымяненне адміністрацыйна-камандных метадаў у сферы кіраўніцтва паступова прывяло да таго, што магчымасці да дзейнасці засталіся толькі ў тых дабраахвотныхных таварыстваў, якія былі патрэбны савецкай уладзе дзеля вырашэння тых ці іншых актуальных задачаў.

### Літаратура


1. Платонаў, Р. П. Беларусь у міжваенны перыяд: Старонкі палітычнай гісторыі ў святле архіўных крыніц / Р. П. Платонаў. – Мінск, Бел НДІДАС, 2001. – 245 с.
2. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (НАРБ). – Фонд 34. – Оп. 1. – Д. 166. Переписка с уполномоченными о порядке утверждения и регистрации обществ и союзов (Минское педагогическое общество, общество кустарей) 5 мая 1922 г. – 5 июня 1924 г. – 282 л.
3. НАРБ. Фонд 34. – Оп. 1. – Д. 165. Постановления и циркуляры ЦИК, СНК и НКВД БССР и переписка с уполномоченными о порядке утверждения и регистрации обществ и союзов. 2 мая 1922 г. – 26 июня 1924 г. – 82 л.
4. НАРБ. – Фонд 34. – Оп. 1. – Д. 178. Заявки учреждений и организаций о выдаче разрешений на изготовление печатаей и штампов. 2 января – 4 июля 1922 г. – 812 л.
5. НАРБ. – Фонд 34. – Оп. 1. – Д. 170. Устав и список членов Минского общества истории и древностей. 26 октября 1922 г. – 16 марта 1925 г. – 12 л.
6. Костюк, М. П. Большевистская система власти в Беларуси / М. П. Костюк. – М.: РАН, 2002. – 340 с.
7. НАРБ. – Фонд 4 п. – Оп. 1. – Д. 1279. Протоколы заседаний бюро ЦК КП(б)Б № 1-137. 15 мая 1924 – 2 декабря 1925. – 473 л.
8. НАРБ. – Фонд. 42. – Оп. 1. – Д. 199. Протоколы совещаний представителей Всебелорусского съезда работников просвещения, заведующих УНО, конференции школьных инспекторов при Главсоцвосе БССР, заседаний правления БГУ и пр. 26 января 1923 – 12 октября 1923. – 52 л.
9. Коржихина, Т. П. Извольте быть благонадежны! / Т. П. Коржихина. – Москва: Изд. РГГУ, 1997. – 372 с.